УДК 947.6 «1917»

М. Я. Сяменчык, дацэнт

# УНУТРЫПАЛІТЫЧНАЕ СТАНОВІШЧА ЛІТОЎСКА-БЕЛАРУСКАЙ ССР ВА ЎМОВАХ НАСТУПЛЕННЯ ПОЛЬСКІХ ВОЙСК (ЛЮТЫ–ЖНІВЕНЬ 1919 г.)

The article dwells upon internal political situation in Lituanian-Belarus SSR under condition of Polish armed forces attack (February-August 1919). Methods of Bolshevik activity in military sphere are shown.

Літоўска-Беларуская ССР, нягледзячы на непрацяглы час яе існавання, выклікала пільную ўвагу даследчыкаў, што, у прыватнасці, увасобілася ў працах У. М. Ігнатоўскага, І. М. Ігнаценкі, В. А. Круталевіча, С. П. Маргунскага, Я. Н. Шкляр. Палажэнні і высновы, дасягненні і хібы азначаных аўтараў грунтоўна даследаваны ў адмысловай манаграфіі Л. Ю. Малыхінай і У. М. Міхнюка «Гістарыяграфія Літоўска-Беларускай ССР. Брэст, 2005. – 119 с. Разам з тым, на нашу думку, ва ўсёй існуючай літаратуры даволі павярхоўна характарызуецца унутрыпалітычнае становішча, якое існавала ў Літбел, зрэшты, у яе беларускіх губернях і паветах. У прыватнасці, няма выразнага ўяўлення: на якія сілы і сацыяльныя пласты абапіраліся органы Савецкай улады ў арганізацыі абароны; якія метады пры гэтым выкарыстоўваліся. На асвятленне гэтых аспектаў і скіраваны азначаны артыкул.

У адпаведнасці з пастановай, прынятай на сумесным пасяджэнні ЦВК Літоўскай і Беларус-кай ССР, новая, Літоўска-Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка (Літбел ССР) мусіла складацца з Мінскай, Гродзенскай, Віленскай, Ковенскай губерняў і часткі Сувалкаўскай са сталіцай у Вільні, з насельніцтвам ад 4 да 7, 5 млн. чалавек [1]. У далейшым Мінская губерня разам з Вілейскім паветам мела пэўную аўтаномію і кіравалася асобным губкамам партыі.

У свой час абвяшчэнне ССРБ абвастрыла ўзаемаадносіны паміж РСФСР і Польшчай. «Пан Васілеўскі, – пісала «Звезда», – як польскі міністр замежных спраў у сваёй тэлеграме Савецкаму ўраду ўказваў, што рускія войскі наваднялюць Літву і Беларусь, тым самым уводзячы савецкую адміністрацыю ў чужых для яе краінах і прыгнятаюць народы тым, што адмаўляюць ім у праве кіраваць сваім лёсам» [2]. Відавочна, што партыя бальшавікоў і ленінскі ўрад пайшлі на рэарганізацыю тэрытарыяльнага ўладкавання Беларусі і Літвы ў абарончых мэтах. Прызначэнне ЛітБел як буфернай (паміж Польшчай і РСФСР) дзяржавы падмацоўвалася яе ўнутраным уладкаваннем, якое мусіла пераканаць Антанту і яе саюзнікаў у легітымнасці ўсталяванай улады. Але, нягледзячы на тое, што ў склад вышэйшых органаў Літбел увайшлі палякі, (у прэзідыум 4 з 7, у СНК 5 з 14), Польшча па-ранейшаму, як і ў выпадку з БССР, лічыла яе бальшавіцкай крэатурай, створанай без удзелу насельніцтва, і таму не хавала сваіх агрэсіўных планаў.

Дзеячы ЦК КП(б) і Саўнаркама Літбела добра ўсведамлялі ролю сваёй рэспублікі ў стратэгічных мэтах ЦК РКП(б) і СНК РСФСР, якая несла асноўны цяжар вайны з інтэрвентамі і «белым» рухам, таму асноўным яе клопатам з’яўлялася ўмацаванне абараназдольнасці краіны, пры гэтым не толькі сваёй, а і тых, дзе ўсталявалася ўлада бальшавікоў. Ва ўмовах, калі ССРБ, а затым ЛітБел ССР адчулі небяспеку агрэсіі з боку Польшчы, іх унутрыпалітычнае становішча значна ўскладнілася і запатрабавала выкарыстання надзвычайных, у сваёй большасці сілавых захадаў, якія ў адпаведнай меры паўплывалі на настроі і формы жыццядзейнасці ўсіх пластоў насельніцтва. Яшчэ падчас аднаўлення Савецкай улады ў канцы 1918 – пачатку 1919 гг. бальшавікі, па іх словах, у інтарэсах дыктатуры пралетарыяту і беднейшага сялянства пры правядзенні сваёй палітыкі абапіраліся ў асноўным на ўзброеную сілу і рэпрэсіўныя метады. А. Мяснікоў у артыкуле заявіў аб нязменнасці прынцыпаў Савецкай улады, маўляў, «яна застаецца старой: поўнае і непадзельнае панаванне партыі камуністаў, нязменная і безумоўная Савецкая ўлада з усімі сваімі атрыбутамі: надзвычайкамі, дыктатарскімі харчорганамі, ваенкамамі і г. д.» [3].

Падобная пазіцыя кіраўніцтва ЛітБел абумовіла складванне ў рэспубліцы своеасаблівага становішча, якое па меры ўзмацнення экспансіі Польшчы набывала рысы безумоўнай і непадзельнай дыктатуры бальшавікоў. У такіх умовах яны не мелі трывалай сацыяльнай базы ў мясцовага насельніцтва. Рабочы клас ЛітБел па многіх прыкметах не ўяўляў сабой адзінай масы, якая падтрымлівала палітыку бальшавікоў.

Невыпадкова, як адзначалася ў справаздачы ЦК КП(б) ЛіБ, «на Беларусі з першага дня ўступлення ў яе савецкіх войск намеціўся курс на прыцягненне дробнай буржуазіі і кіруючых сацыялістычных партый: Бунда, Паалей Цыёна і аб'яднанай яўрэйскай сацыялістычнай пар-тыі» [4, с. 143]. Нягледзячы на нацыяналіза-цыю сродкаў вытворчасці і ўвядзенне закана-даўства ў інтарэсах рабочых, іншыя сацыяль-на-эканамічныя захады Савецкай улады, пра-цэс іх (рабочых) уцягнення ў сацыялістычнае будаўніцтва абмяжоўваўся, як правіла, вытворчай сферай. Асобныя прафесійныя саюзы, якія пайшлі на супрацоўніцтва з бальшавікамі, выказвалі пэўную зацікаўленасць у сумесных дзеяннях, маючы на ўвазе магчымасці лепшага задавальнення інтарэсаў працоўных. У гарадскіх Саветах прысутнічалі рэдкія прадстаўнікі эсэраў, меншавікоў, бундаўцаў, паалейцыяністаў, але яны не пакідалі істотнага ўплыву на азначаныя органы ўлады, пры гэтым самі падвяргаліся няспыннай ідэйнай крытыцы з-за нязгоды з бальшавікамі па тых ці іншых пытаннях.

Існаваўшыя ў рабочым асяроддзі суполкі яўрэйскіх партый, нягледзячы на ідэйныя рознагалоссі з бальшавікамі, мусілі супрацоўнічаць з імі ў пытаннях абароны рэспублікі, якой пагражала Польшча. У гэтым сэнсе падкантрольныя прафсаюзам і левым яўрэйскім партыям працоўныя ўяўлялі для ўзброеных сіл ЛітБел істотны патэнцыял. Яны ж, гэтыя рабочыя, фарміравалі асноўныя кадры харчовых атрадаў, удзельнікаў «суботнікаў» і «васкрэснікаў», курсантаў Усеагульнага вайсковага навучання (Всевобуч) і інш. Органы савецкай улады імкнуліся прыцягнуць жанчын да ўдзелу ў грамадскім жыцці і кіраванні дзяржаўнымі ўстановамі. Адпаведныя жаночыя аддзелы былі ўтвораны ў Мінску і Бабруйску [4, с. 145–146]. У буйнейшых гарадах утварыліся суполкі Камуністычнага саюзу моладзі.

Паводле класавых падыходаў кіруючай партыі, сялянства складалася з трох пластоў – беднякоў, сераднякоў і кулакоў. Менавіта першыя павінны былі зрабіцца яе апорай у вёсцы пры стварэнні вясковых, сельскіх і валасных Саветаў сялянскіх і батрацкіх дэпутатаў. Пра-ва абіраць і быць абранымі надавалася толькі тым гаспадарам, чый зямельны надзел не перавышаў 5 дзесяцін, таму асноўная маса сялянства, у тым ліку серадлякі, не былі прадстаўлены ў азначаных Саветах. Так, у І з'ездзе Саветаў Літвы, які выказаўся за ўтварэнне ЛітБел, разам з рабочымі і чырвонаармейцамі бралі ўдзел не сялянскія, а «беззямельныя» і «малазямельныя» дэпутаты [4, с. 131]. Аднак перш за ўсё ў іх абіралі сельскагаспадарчых рабочых – батракоў, якія ў большасці выпадкаў з'яўляліся асноўнымі праваднікамі бальшавіцкай палітыкі ў аграрным сектары і харчовым пытанні. Пры гэтым, у адрозненне ад першых месяцаў пасля ўсталявання Савецкай улады ў 1917–1918 гг., калі на Беларусі практычна не існавала бальшавіцкіх суполак на вёсцы, на пачатку 1919-га іх з'яўленне актыўна стымулявалася з дапамогай губернскіх і павятовых цэнтраў КП(б) ЛіБ. Разам з тым уцягненне вёскі ў рэчышча бальшавіцкай палітыкі запавольвалася адсутнасцю радыкальнай аграрнай рэформы, а таксама забаронай свабоднага продажу прадуктаў сваёй працы, харчразвёрсткай, людскімі і конскімі мабілізацыямі. Мала таго, у шэрагу месцаў адбыліся антысавецкія сялянскія паўстанні ў Слуцкім, Вілейскім, Браслаўскім і Дзісненскім паветах [5, с.105].

Вядома ж, каб не згубіць апоры ў сялянстве, бальшавіцкія ўлады мусілі тлумачыць гэтыя выступленні як вынік контррэвалюцыйнай агітацыі з боку польскіх агентаў, буржуазіі, памешчыкаў і іншых варожых сіл, але ніяк не вынікамі сваёй палітыкі.Невыпадкова класы былых эксплуататараў – буржуазіі і памешчыкаў, а таксама святарства, былыя чыноўнікі, афіцэры царскай арміі, «буржуазная» інтэлігенцыя траплялі ў разрад праціўнікаў Савецкай улады і яе патэнцыяльных ворагаў, і таму падвяргаліся моцнаму палітычнаму, эканамічнаму, псіхалагічнаму і часам нават фізічнаму ўздзеянню з боку адпаведных уладных структур, а таксама рабочых і сялянскіх арганізацый. Можна меркаваць, што ў такіх умовах рэальная падрыўная актыўнасць азначаных пластоў была нязначнай, а прадпрынятыя супраць іх рэпрэсіі – не адэкватнымі нанесенымі імі ўрону.

Куды большую шкоду ўладам і грамадству прыносілі разнастайныя групы маргінальных, дэкласіраваных элементаў – ад люмпенаў і дэзерціраў да крымінальных асоб і бандыцкіх шаек, якія ўзніклі ў розных населеных пунктах Беларусі яшчэ пасля Лютаўскай рэвалюцыі, і асабліва актывізаваліся з усталяваннем бальшавіцкай улады.

Вядома, што ў такіх умовах унутрыпалітычнае становішча ЛітБел не магло быць трывалым і па меры ўзмацнення наступлення польскіх легіёнаў яе партыйнае і савецкае кіраўніцтва прыкладала максімум арганізацыйных, агітацыйна-прапагандысцкіх і сілавых намаганняў, каб стабілізаваць яго ў першую чаргу для патрэб абароны. Пры гэтым, што датычыць тылавой работы, то на ўсіх этапах існавання рэспублікі асноўная яго (кіраўніцтва) энергія канцэнтравалася менавіта на падаўленні ўсіх праяў антысавецкай дзейнасці. Так, у паведамленні аб увядзенні ваеннага становішча ў Бабруйску ваенныя ўлады папярэдзілі, што «асобы, якія заклікаюць да пагрому, агітуюць супраць Савецкай улады і падбухторваюць да беспарадкаў, будуць расстрэльвацца

ш месцы без суда». Камісар па ваенных справах ССРБ, абвясціўшы Мінскую губерню на ваенным, а чыгуначную лінію Вільня – Жлобін – Барысаў на асадным становішчы, загадаў «не шкадаваць усіх тых, хто правакацыяй, сабатажам і сваёй контррэвалюцыйнай воляй будзе спрыяць здзяйсненню злачынных намераў польскіх памешчыкаў і генералаў, якія за-махваюцца на зямлю, хлеб, гарады і жыццё нашых рабочых, сялян і салдат» [7].

Характэрна, што пад выглядам барацьбы з контррэвалюцыяй падаўлялася ўся антыбальшавіцкая апазіцыя. Пры гэтым прадпрынятыя чэкістамі захады набылі такія жорсткія формы і шырокія маштабы, што нават у асяроддзі саміх бальшавікоў узніклі сумненні адносна мэтазгоднасці такой палітыкі. У выніку А. Мяснікоў у адказ на «рэзкія галасы за скасаванне Надзвычкамаў» мусіў выступіць з адпаведнымі тлумачэннямі [8] і, як вынік, прыслухаўся да саратнікаў і грамадскай думкі. У выніку Надзвычайныя камісіі былі скасаваны [4, с. 143], але ў сувязі з наступленнем легіянераў на Вільню праблема надзвычайных мер ізноў актуалізавалася.Невыпадкова 18 красавіка «Минский пролетарий» звярнуўся «Да пытання аб Надзвычайных камісіях». А пасля таго, як Белітармія не здолела адстаяць Вільню, яны (НК) былі аднаўлены ізноў. Як выявілася, адной з прычын хуткага захопу палякамі сталіцы ЛітБел з'яўлялася менавіта адсутнасць актыўнай барацьбы супраць контррэвалюцыі. Каб наперад не паўтарыць дапушчаных памылак, чэкісты ЛітБел на чале з Я. Далецкім і І. Апанскім правялі шэраг прэвентыўных мерапрыемстваў па ізаляцыі патэнцыяльных праціўнікаў Савецкай улады, у тым ліку моладзі. Паводле газеты «Звезда», «у ліку арыштаваных 15 сакавіка заложнікаў буржуазіі г. Слуцка апынуўся мясцовы кадэт, студэнт Багдашыц». У Мінску камсамольцы запатрабавалі закрыцця «Гуртка культурна-асветніцкага развіцця юнацтва «як гнязда контррэвалюцыі» [10]. Любыя панічныя чуткі, якія распаўсюджваліся ў гарадах, адносіліся ўладамі на кошт «буржуазіі і яе прыхвасняў»[11]. У ліку прадпрынятых акцый – турэмнае зняволенне прадстаўнікоў азначаных колаў. У маі 1919 г. Савет Абароны ЛітБел абвясціў аб расстрэле арыштаваных «польскіх памешчыкаў «у адказ на расстрэлы нашых таварышаў у Вільні, у адказ на пагромы і гвалты, якія адбываліся пры заняцці Вільні» [12].

Можна меркаваць, што сістэма заложніцтва і «чырвоны тэрор», якія здзяйсняліся «надзвычайкамі» у тыле, выклікалі абурэнне жыхароў, нават саратнікаў па барацьбе з польскім агрэсарам. «Няхай сабе кажуць розныя меншавіцкія «камуністы» з Бунда, – пісала «Звезда», – што, уласна кажучы, ніякай контррэвалюцыі ў тыле ў нас няма; няхай абураюцца разам з абывацелямі расстрэламі контррэвалюцыянераў, спекулянтаў і бандытаў, – мы ведаем, што на вайне неабходна дзейнічаць, як на вайне» [13]. У падмацаванне сваіх слоў мінскія чэкісты на пачатку жніўня «ўзялі пад залог» прадстаўнікоў польскай буржуазіі і інтэлігенцыі [14], а ўрад ЛітБел папярэдзіў «польскіх белагвардзейцаў і ўсю мінскую буржуазію», што на «белы тэрор» адказам будзе «чырвоны тэрор пралетарыята» [15].

Барацьба супраць буржуазных элемен-таў адбывалася і ў сферы занятасці. Так, у красавіку яны былі выдалены з устаноў мінскай гарадской гаспадаркі [16], а пасля ўвядзення 18 красавіка «Дэкрэта аб усеагульнай працоўнай павіннасці» [17] іх становішча пагоршылася яшчэ больш. Як пісала газета «Звезда» 10 мая, «Мінскі Савет рабочых і чырвонаармейскіх дэпутатаў і Праўленні прафсаюзаў грамавымі апладысментамі прынялі прапанову Я. Бош аб мабілізацыі буржуазіі для цяжкіх тылавых работ». Пры гэтым любы наўмысны ці ненаўмысны невыхад на працу расцэньваўся як саба-таж. Невыпадкова ў маі ў Барысаве пачалося стварэнне канцэнтрацыйнага лагеру для буржуазіі. «Там мы збярэм усю гэтую паршывую карыслівую банду, – пісаў В. Кнорын. – Там мы іх прымусім упершыню прыступіцца да вытворчай працы, каб пракарміць сябе [18]. У цэлым не толькі буржуазія, а ўсе «непралетарскія» пласты гарадскога насельніцтва знаходзіліся пад пільным палітычным і фіскальным наглядам органаў Савецкай улады.

У гэтым сэнсе вёска таксама адчувала ўздзеянне бальшавіцкіх пастаноў. Па сутнасці, усе яны скіроўваліся на выкананне сялянамі харчовых праграм (продаж па нарыхтоўках, развёрстка, падарункі, ахвяраванні), адпраўку дабраахвотнікаў і мабілізаваных і пастаўку коней у Чырвоную армію; здачу зброі і ваеннай амуніцыі; барацьбу з дэзерцірствам. Па вялікім рахунку сяляне ЛітБел з прычыны ментальных асаблівасцей, а таксама з улікам набытага за час неаднаразовай перамены ўлады вопыту, стараліся пазбягаць адкрытых канфліктаў з уладай (асабліва падмацаванай узброенымі сіламі) і выканаць той ці іншы загад або дырэктыву. Пры гэтым бальшавіцкая ўлада ў сваіх органах друку акцэнтавала ўвагу чытача менавіта на станоўчых момантах актыўнасці сялян, падаючы любыя спробы процідзеяння як наступства кулацкай або белапольскай агітацыі. Варта адзначыць, што ў дальнейшым гэтая палітыка заставалася нязменнай на ўсім працягу існавання ЛітБел, праўда, з пэўным улікам абставін. Так, 29 студзеня 1919 г. з мэтай вырашэння харчовай праблемы і падрыву эканамічнага стану заможных пластоў насельніцтва ўся буржуазія, а таксама заможнае сялянства былі абкладзены «Надзвычайным рэвалюцыйным падаткам».

У іх ліку азначаная катэгорыя жыхароў Слуцка мусіла выплаціць 1 млн., а павета – 2,5 млн. рублёў. Як адзначалася ў справаздачы, «пры абкладанні стараліся зусім не закрануць нават сераднякоў». Але, маючы на ўвазе, што адной з важнейшых задач Савецкай улады з'яўлялася «выпампаванне хлеба» [4, с. 141], вядома ж, яно не магло не закрануць і серадняцтва, і бядняцтва. Такі ж збор здзейснілі і жыхары Гарадзейскай воласці, Навагрудскага павета [19] пры тым, што ў самім павеце харчовае становішча было вельмі складаным. «Калісьці багатыя воласці – Шчорсаўская, Любчанская, Карэліцкая ўяўляюць зараз карціну разбурэння і запушчанасці, – пісаў «Минский пролетарий». – Бежанцы, якія вяртаюцца, знаходзяць прытулак у большасці выпадкаў у акопах і бліндажах, жывуць па некалькі сямей разам, распаўсюджваюць эпідэміі і гінуць сотнямі. За адсутнасцю хлеба сяляне харчуюцца ляпёшкамі, прыгатаванымі з усялякіх траў. Былі нярэдка выпадкі атручвання падобным хлебам. Абарваныя, апухлі ад голаду» [20].

Па сутнасці, вырашэнне харчовай праблемы спалучала розныя формы збору хлеба на вёсцы: закупкі па «цвёрдых» цэнах, дабраахвотныя ахвяраванні («Падарунак Чырвонай арміі» і інш.). Кожнай форме, як правіла, папярэднічала адпаведная агітацыя. «15 сакавіка абвяшчаецца «Хлебны тыдзень для Чырвонай арміі, – пісала «Звезда», – «Калі хто-небудзь з вас схавае лішняе зярно ад Чырвонай арміі, спадзеючыся на гэтым нажыць адну-другую сотню рублёў, той здраднік несказана горшы за Іуду» [21]. Так, з'езд сельскіх саветаў Бягомльскай воласці пастанавіў адпусціць з маёнтка Берасноўкі 100 пудоў гароху і 25 пудоў жыта, і звыш таго, даручыць усім вясковым і сельскім саветам сабраць з кожнага жыхара, «па добрай волі» харчовыя прадукты «на падарунак Чырвонай арміі» [22]. ЦВК Саветаў Літбел у першай палове красавіка пастанавіў «стварыць камісію па збору падарункаў для Чырвонай арміі» [23].

Такім чынам, харчаванне Белітарміі цал-кам лягло на мясцовае сельскае насельніцтва і ўяўляла сабой бадай самую стабільную яго крыніцу. Наколькі гэтыя ахвяраванні былі істотнымі, можна, напрыклад, меркаваць з паведамлення аб тым, што Красніцкае вясковае грамадства з 46 гаспадарак сабрала 7 пудоў хлеба) [24]. Жыхары Вязнікоўскай воласці Вілейскага павета на 1 мая подаравалі 3-й батарэі 1 Лёгкага Артдывізіёну 320 яек. [25]. Сяляне вёскі Жаўлак прыступіліся да дабрахвотнага збору ахвяраванняў для Чырвонай арміі – у выглядзе прадуктаў, фуражу і палатна [11].

Нарыхтоўчыя органы стараліся абапірацца на прынцып дабрахвотнай здачы сялянамі прадуктаў і стараліся стымуляваць яго праз прэсу, адпаведныя мітынгі і г. д. З цягам часу сяляне сталі прыцягвацца да кампаній па збо-ру абмундзіравання, амуніцыі і зброі. Віда-вочна, прынцып дабрахвотнасці сябе не апраў-даваў, бо ў канцы сакавіка быў абвешчаны за-гад ваенных улад за № 124 «Аб здачы абмундзіравання казённага ўзору»[26], які пагражаў суровым пакараннем за яго невыкананне. У другім выпадку ўлады спрабавалі ўзняць бядняцтва на збор ваеннага снаражэння, якое быццам хавалі заможныя пласты насельніцтва. Так, звяртаючыся да «беднякоў вёскі і горада», органы ўлады прасілі іх дапамагчы «узяць у буржуазіі і кулакоў патрэбнае для арміі абмундзіраванне, якім яны валодалі» [27]. «Калі вы не здасцё зброі, – пісаў «Набат» – яго ўсёроўна знойдуць і вас расстраляюць. Уся зброя – Чырвонай арміі...Зброя не патрэбна ні беднякам, ні сераднякам, яе хаваюць толькі кулакі» [28]

Мабілізацыя сялян адбывалася яшчэ цяжэй. Па сутнасці, яны не выказвалі жадання ваяваць, аддаючы перавагу сваім гаспадарчым праблемам. Многія з іх не адчувалі небяспекі з боку польскіх войск, аб «вызваленчай» місіі якіх паведамлялася ў шматлікіх прапагандысцкіх лістоўках. «Велізарныя прасторы Літвы і Беларусі, – гаварылася ў адной з іх, – топчуцца подлымі нагамі нашых спрадвечных ворагаў – маскалёў, якія ганьбяць храмы боскія, апаганьваюць наша жыллё, знішчаюць мову польскую, знішчаюць народныя багацці і «весь скарб» [29]. Са свайго боку савецкія работнікі імкнуліся растлумачыць сапраўдныя прычыны вайны і тым зменшыць ўздзеянне варожай агітацыі. Так, Навагрудскі камісарыят ў адозве «Чаго нам чакаць ад польскіх панскіх легіянераў?» тлумачыў, «што гэта ідуць ворагі вашы, вам нечага чакаць ад іх, ні міласці, ні літасці» [30].

Але вынікі прапаганды і контрпрапаганды не заўсёды складваліся на карысць Савецкай улады. Былі выпадкі, калі сяляне нават адмаўляліся выконваць адпаведныя пастановы мясцовых улад. Як казалі жыхары Будслава Вілейскага павета, што падлягалі прызыву ў войска, «калі будзе мабілізацыя, не пойдзем і баста, а за што брату брата рэзаць, за што дарма кроў праліваць?» [31]. Як паведамляў іншы карэспандэнт, у Навагрудскім павеце «кулацтва карыстаецца выпадкам і распаўсюджвае недарэчныя чуткі аб тым, што бальшавікі хутка вас усіх згоняць разам, пасадзяць на кацёл, дадуць жыда-камісара, будуць ганяць на працу па званку і г.д.» [32]. Вядома ж, для барацьбы з такімі размовамі выкарыстоўваліся розныя метады. Да прыкладу, каб прыпыніць паклёпніцкія і панічныя чуткі, улады Слуцка наладзілі мітынг з удзелам 1500–2000 сялян, якія з'ехаліся на гарадскі базар з 25 валасцей [33].

Між тым ваеннае становішча запатрабавала ад органаў Савецкай улады значнага

папаўнення Белітарміі. 2 мая 1919 г. Савет абароны Літбел пастанавіў заклікаць сярэдняе і бяднейшае сялянства да барацьбы з ворагам. Ад кожнай воласці патрабавалася вылучыць не менш 20 сялян. Прычым бальшавіцкія агітатары імкнуліся да таго, каб набор адбываўся дабрахвотна. Акрамя таго, прадстаўнікі сельскіх Саветаў бралі на сябе абавязак напружыць намаганні для ўмацавання фронта, забяспечыўшы адпраўляемых на фронт байцоў усім неабходным, як зброяй, верхнім абмундзіраваннем, так і прадуктамі [4, с. 151].

Вядома, што ў тых умовах настроі сялянства ў большай ступені залежалі ад бальшавіцкай палітыкі ў харчовым і аграрным пытанні, чым ад агітацыі. Тым не менш патрэбы Савецкай улады ў абароне ад польскіх захопнікаў не заўсёды адпавядалі яго (сялянства) інтарэсам. Невыпадкова 8 мая 1919 г. загад Савета абароны Літбел № 10 забараняў вайсковым часцям, і тым больш – асобным чырвонаармейцам у час пасяўной «здзяйсняць у насельніцтва рэквізіцыю або прымусовы абмен апошняга ў гаспадарцы каня, каровы і рэквізаваць пакінутае на насенне збожжа» [34]. Відавочна, што падобныя выпадкі мелі масавы характар і зрабіліся звычайнай справай.

Не спрыяла ўмацаванню Савецкай улады і практыка канфіскацыі коней у сялян за «укрывальніцтва дэзерціраў» [11], частыя рэквізіцыі, адсутнасць дапамогі сем'ям чырвонаармейцам [35].

Тым не менш бальшавіцкі друк імкнуўся пераканаць чытачоў у поўнай падтрымцы сялянства Савецкай улады, якое, па словах газеты «К оружию», «бачыць у Чырвонай арміі сваю выратавальніцу ад польскіх п'яных банд і іх афіцэраў-гвалтаўнікоў. Бярыце ўсё, – кажуць сяляне, – мы згодны лепш галадаць, чым пусціць да сябе ізноў польскіх паноў» [36]. Паводле слуцкай газеты, такія ж настроі выказвалі «батракі савецкіх маёнткаў, сцвярждаючы, што як адзін ульюцца ў Чырвоную армію, калі толькі падыйдуць белыя» [11].

З узмацненнем націску акупантаў тлумачальная работа вельмі ўскладнілася. Так, у тым самым Слуцкім павеце ў сярэдзіне ліпеня на фронт і «для работы ў валасцях» былі мабілізаваны апошнія 14 бальшавікоў [11], таму агітаваць сялянства жывым словам ужо не было каму. Што датычыць польскай агітацыі і прапаганды ў гэты час, то, як пісала газета «Звезда», «кожны тыдзень польскія аэрапланы частуюць нас адозвамі, у якіх усхваляюць свабодны лад найяснейшай Рэчы Паспалітай» [37]

Важным накірункам умацавання бальшавікамі сваіх пазіцый сярод працоўных горада і вёскі з'яўлялася ўтварэнне новых партыйных арганізацый. Менавіта з іх дапамогай адбывалася фарміраванне патрэбнай грамадскай думкі, актывізацыя дапамогі фронту прадуктамі, амуніцыяй, зброяй, жывой сілай. Мала таго, менавіта камуністы з'яўляліся цэментуючай сілай органаў улады (Саветаў і рэвалюцыйных камітэтаў), атрадаў асобага прызначэння, часцей навабранцаў. Іншая справа, што на пачатку мая 1919 г., калі пачалося наступленне польскіх легіянераў на мінскім напрамку, амаль усе яны былі мабілізаваны на перадавыя пазіцыі, для працы ў тыле не хапала работнікаў.

Нягледзячы на ўсебаковую напружаную дзейнасць ЦК партыі, СНК ЛітБел, і Савета абароны, пры значнай дапамозе РСФСР, у РВС Заходняга фронту не хапіла сіл, каб адстаяць незалежнасць рэспублікі. Пасля страты Мінска, Слуцка, Ігумена да канца жніўня 1919 г. польскія войскі былі спынены толькі на рубяжы Бярэзіны. Агульнавядомы той факт, што асноўнай прычынай іх адносна лёгкай перамогі з'яўлялася перавага ў жывой сіле і матэрыяльным забеспячэнні. Але не толькі. Відавочна, што ўнутраная палітыка бальшавікоў у ЛітБел не знайшла той падтрымкі, на якую разлічвалі яе кіраўнікі і арганізатары. Нават калі не мець на ўвазе тыя пласты насельніцтва (былыя памешчыкі, буржуазія, святарства, чыноўніцтва і інш.), якія па прынцыповых матывах адмоўна ставіліся да ўлады бальшавікоў, то і ў гэтым выпадку іх сацыяльнай апорай з'яўлялася меншая частка сялянства, галоўным чынам беднякі. А іх эканамічны патэнцыял быў не настолькі вялікім, каб задаволіць патрэбы горада і арміі ў харчаванні. Серадняцтва таксама не выявіла сябе шчырым прыхільнікам бальшавіцкай улады і выконвала яе распараджэнні ў асноўным з-за страху пакарання. Адзінае, што іх звязвала з ёй, гэта мабілізаваныя ў Чырвоную армію аднавяскоўцы, сваякі і інш. З прычыны невысокага адукацыйнага і палітычнага ўзроўню развіцця ўсе сяляне не ўспрымалі перспектыву наступлення легіянераў як істотную для сябе пагрозу. Таму ж спрыяла ўздзеянне польскай агітацыі, у тым ліку ксяндзоў, на жыхароў ЛітБел каталіцкага веравызнання. Са свайго боку кіраўнікі Савецкай улады ў вуснай і друкаванай прапагандзе нават не прадпрымалі спроб уздзейнічаць на патрыятычныя пачуцці насельніцтва рэспублікі, аддаючы перавагу класавым і інтэрнацыянальным лозунгам. Пры гэтым зварот да сялян за дапамогай не падмацоўваўся канкрэтнай аграрнай палітыкай, якая б стымулявала развіццё сельскагаспадарчай прадукцыі ў інтарэсах вытворцаў. Пазбаўленне выбарчага права асноўнай масы сялянства абумовіла ўтварэнне, па сутнасці, бядняцкіх Саветаў, якія служылі сродкам распальвання класавай барацьбы на вёсцы, скіраванай супраць заможнага жыхарства. Натуральна, што апошняе, так званае «кулацтва» стала ў апазіцыю да Савецкай улады, папаўняла

колькасць паўстанцаў, «зялёных» і іншых «контррэвалюцыянераў».

Станоўчае стаўленне рабочых да Савец-кай ўлады ў найлепшай ступені выявіла сябе пад час мабілізацый на фронт. У дадзеным выпадку працоўныя гарадоў і мястэчак больш выразна ўсведамлялі патрэбы рэвалюцыі ў абароне ад ворага. Не апошнюю ролю ў іх падтрымцы палітыкі бальшавікоў адыгрывала і тая акалічнасць, што легіянеры ў акупіраваных гарадах ЛітБел праводзілі жорсткія рэпрэсіі ў дачыненні членаў рабочых партый (КП(б) ЛітБел, Бунд, Паалей Цыён) і прафсаюзных арганізацый. Усведамленне небяспекі польскай заваёвы прымушала гарадскіх працоўных, у сваёй большасці яўрэяў, рухацца ў рэчышчы бальшавіцкай палітыкі і садзейнічаць ёй.

У цэлым унутрыпалітычнае становішча Літоўска-Беларускай ССР за ўвесь паўгадовы час існавання характарызавалася няўстойлівасцю і адсутнасцю ўсенароднай падтрымкі існаваўшага рэжыму ўлады, найважнейшым сродкам падтрымання якога з'яўляліся прымус і рэпрэсіі, у выніку чаго колькасць незадаволеных толькі ўзрастала. Невыпадкова, што з прыходам «польскіх банд, – пісаў аршанскі «Набат», – яны ўказваюць камуністаў і актыўных прыхільнікаў Савецкай улады, якія засталіся, а тыя распраўляюцца з імі па-свойму. Неабходна ўзмацніць пільнасць чэкістаў, патрэбна ўсіх западозраных у контррэвалюцыі арыштоўваць у якасці заложнікаў...Вільня і Мінск павінны служыць для нас прыкладам» [38]. Відавочна, што правільных высноў адносна прычын свайго паражэння ў барацьбе за ЛітБел бальшавікі так і не зрабілі.

## Літаратура

1. Энцыклапедыі гісторыі Беларусі // БелЭн. – Мінск, 2004. Т. 4. – С. 382.
2. Звезда. – 1919. – 28 января.
3. Бедняк. – 1918. – 14 декабря.
4. По воле народа: из истории образования БССР и создания КПБ: документы и материалы / сост. М. Ф. Шумейко [и др.]. – Минск: Беларусь, 1988.
5. Шкляр, Е. Н. Борьба трудящихся Литовско-Белорусской ССР с иностранными интервентами и внутренней контрреволюцией (1919–1920 г.) / Е. Н. Шкляр. – Минск.: Госиздат БССР, 1962.
6. Звезда. – 1919. – 8 февраля.
7. Звезда. – 1919. – 28 февраля.
8. Звезда. – 1919. – 11 февраля.
9. Звезда. – 1919. – 28 марта.
10. Минский пролетарий. – 1919. – 29 апреля.
11. Плуг и Молот. – 1919. – 17 июля.
12. Бедняк. – 1919. – 6 мая.
13. Звезда. – 1919. – 24 июля.
14. Звезда. – 1919. – 1 августа.
15. Звезда. – 1919. – 3 августа.
16. Минский пролетарий. – 1919. – 11 апреля.
17. Минский пролетарий. – 1919. – 18 апреля.
18. Звезда. – 1919, 18 мая.
19. Звезда. – 1919, 2 марта.
20. Минский пролетарий. – 1919. – 14 апреля.
21. Звезда. – 1919. – 16 марта.
22. Звезда. – 1919. – 27 февраля.
23. Минский пролетарий. – 1919. – 13 апреля.
24. Звезда. – 1919. – 25 февраля.
25. Бедняк. – 1919. – 20 мая.
26. Звезда. – 1919. – 28 марта.
27. Минский пролетарий. – 1919. – 12 апреля.
28. Набат. – 1919. – 16 июля.
29. Звезда. – 1919. – 22 марта.
30. Звезда. – 1919. – 19 марта.
31. Бедняк. - 1919. – 22 марта.
32. Минский пролетарий. – 1919. – 12 апреля.
33. Минский пролетарий. – 1919. – 24 апреля.
34. Звезда. – 1919. – 10 мая.
35. Набат. – 1919. – 14 августа.
36. К оружию. – 1919. – 18 июня.
37. Звезда. – 1919. – 3 августа.
38. Набат. – 1919. – 18 августа.